«БелАЗаўскі акорд» адкрывае таленты

У Жодзіне прайшоў штогадовы рэспубліканскі конкурс «БелАЗаўскі акорд».

Адна з яго ўмоў — удзельнікі не павінны быць маладзейшыя за 16 і старэйшыя за 30 гадоў. Мерапрыемства сабрала юнакоў і дзяўчат з розных куткоў Беларусі і іншых краін. Сёлета, як ніколі, быў высокі ўзровень падрыхтоўкі канкурсантаў, адзначылі ў журы. На конкурс паступіла 33 заяўкі. Па выніках праслухоўвання ў фінал выйшлі 16 удзельнікаў. Гэта прадстаўнікі з Брэста, Віцебска, Баранавіч, Жодзіна, Магілёва, Маладзечна, Мінска, Оршы, Лепеля, а таксама расійскага Табольска. Выступленне артыстаў суправаджаў узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Беларусі.

Ацэньвала творчыя здольнасці журы, у якое ў тым ліку ўваходзілі лідар фолк-групы «Палац» Алег Фаменка, кампазітар Алег Елісеенкаў і галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Беларусі Віктар Бабарыкін. Пераможцам фестывалю стала мінчанка Ангеліна Васілеўская, якой уручылі Гран-пры.

Арганізатары конкурсу — Мінаблвыканкама і ААТ «БелАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ» мелі на мэце выявіць новых таленавітых выканаўцаў, далучыць моладзь да актыўнай творчай дзейнасці, папулярызаваць беларускую песню. Мерапрыемства праводзіцца з 2002 года. За сваю гісторыю яно дало магчымасць адкрыць новыя імёны, дапамагло раскрыцца таленту выканаўцаў, многія з якіх прадоўжылі паспяховыя выступленні на канцэртных і фестывальных пляцоўках краіны і за яе межамі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Як нас дураць

ДАВЕРЛІВЫМІ БЫВАЮЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ГРАМАДЗЯНЕ

Супрацоўнікі Маладзечанскага РАУС праводзяць праверку па факце крадзяжу грашовых сродкаў з банкаўскага рахунку мясцовай фірмы, якая займаецца вытворчасцю вокнаў ПВХ. Пра інцыдэнт у міліцыю паведаміў дырэктар прадпрыемства. Паводле яго слоў, урон склаў каля 40 тысяч рублёў.

У ходзе правядзення шэрагу аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў праваахоўнікі ўстанавілі, што з дапамогай сістэмы «Кліент-банк» былі ажыццёўлены восем грашовых пераводаў. Больш за 4 тысячы рублёў «сышлі» на рахункі бізнес-партнёраў. У астатніх выпадках грошы, прыблізна 36 тысяч, былі пераведзеныя на адрас ілжывых банкаўскіх рахункаў невядомых фізічных асоб.

Як высветлілася, у кампаніі на камп'ютары не была ўсталяваная антывірусная абарона. Вось на чым дакладна не трэба было эканоміць. А таму і адбылося заражэнне ПК, што дазволіла зламыснікам атрымаць доступ да канфідэнцыяльнай інфармацыі і аддаленага кіравання камп'ютарам. Дарэчы, у такіх выпадках факт заражэння шкоднасным праграмным забеспячэннем карыстальнік можа і не заўважыць. Падабраўшы момант, калі ключ электроннага лічбавага подпісу быў падключаны да камп'ютара, махляры афармілі плацежныя даручэнні на перавод грашовых сродкаў, падпісалі іх электронным лічбавым подпісам прадпрыемства і накіравалі на выкананне ў банк.

У дзеяннях зламыснікаў, па словах **старшага інспектара аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама Надзеі ЯРАШОВАЙ,** маюцца прыкметы крадзяжу шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі ў асабліва буйным памеры (ч. 4 ст. арт. 212 КК).

Аналагічныя выпадкі здзяйснення крадзяжу грашовых сродкаў з рахункаў арганізацый розных формаў уласнасці зафіксаваныя апошнім часам таксама ў Мінскім, Слуцкім і Барысаўскім раёнах.

Міліцыя, якая працуе ў раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій, такім вось даверлівым кіраўнікам (і не толькі ім) раіць устанавіць на свой камп'ютар або мабільную прыладу антывірусное праграмнае забеспячэнне і рэгулярна яго абнаўляць. Ні ў якім разе не варта пераходзіць па сумніўных (фішынгавых) спасылках і запускаць загружаныя з сеціва інтэрнэт-файлы без папярэдняй іх праверкі на спецыялізаваных сеткавых рэсурсах (напрыклад, https://www.virustotal.com). Не трэба захоўваць паролі ў браўзеры і якіх-небудзь тэкставых дакументах на сваім рабочым камп'ютары.



Для работы ў сістэмах дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання спецыялісты раяць выкарыстоўваць асобны камп'ютар з устаноўленым ліцэнзійным праграмным забеспячэннем (гэта дазваляе атрымліваць апошнія абнаўленні бяспекі), антывірусным праграмным забеспячэннем, настроенымі абмежаваннямі правоў на выкарыстанне электроннай пошты і доступу да інтэрнэт-рэсурсаў.

Выкарыстоўваць ключ электроннага лічбавага подпісу толькі ў той час, калі ёсць у гэтым неабходнасць, а ў астатні час яго неабходна выдаляць з камп'ютара.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

Надвор'е

Начныя замаразкі да мінус 6 градусаў

Тэмпературны фон на гэтым тыдні будзе на 1—3 градусы ніжэй за кліматычную норму

Апошнія дні кастрычніка прынясуць нам значнае пахаладанне, дзённыя тэмпературы не будуць перавышаць плюс 10 градусаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Вось так, адным махам, цяпло пакідае тэрыторыю нашай краіны. На гэтым тыдні пад уплывам малаактыўных атмасферных франтоў і паветраных мас, якія паступаюць з паўночных шырот, усталюецца халоднае надвор'е, калі месцамі пройдуць дажджы і мокры снег. У сераду, 30 кастрычніка, працягне паступаць халоднае паветра з поўначы Еўропы, і пахаладанне ўзмоцніцца. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, удзень будзе ад нуля да плюс 5 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны — да 7 цяпла. Уначы месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег, у асобных раёнах чакаюцца туман, слабы галалёд. Удзень будзе пераважна без ападкаў.

Чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу ды дажджу і ў чацвер. Мокры снег будзе ісці месцамі пераважна па паўночнай палове краіны. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман, слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла, але месцамі паветра астудзіцца да 6 градусаў марозу. Удзень сонца будзе прыгравацъ і прагназуецца ад 1 да 7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу, у першы дзень лістапада, месцамі, пераважна па паўночна-ўсходняй палове краіны, таксама пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла, пры праясненнях яна панізіцца да мінус 6 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 1 па паўночным усходзе да плюс 7 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

Цяпло скончылася.

Сяргей КУРКАЧ.

Здарэнне

Лодку перакуліла ветрам

Паведамленне пра тое, што тры чалавекі апынуліся ў вадзе і тонуць на возеры Сялява паблізу вёскі Дубы Крупскага раёна, паступіла ад аднаго з пацярпелых.

Калі ратавальнікі прыбылі на бераг возера, на адлегласці каля 300 метраў ад яго ў вадзе каля перакуленай лодкі знаходзіліся тры чалавекі, самастойна выбрацца яны не маглі. Высветлілася, што яны ішлі на лодцы пад ветразем, калі з-за моцнага парыву ветру яна перакулілася, і людзі апынуліся ў вадзе. Пасля агляду брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі ўстаноўлена, што выратаваныя ў медыцынскай дапамозе не маюць патрэбы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Извещение об открытом аукционе по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома. Организатор аукциона – Жемчужненский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области

Место расположения земельного участка, адрес, кадастровый номер	Характеристика инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка, га	Назначение земельного участка	Начальная цена объекта, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона, руб.
Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский р-н, Жемчужненский с/с, аг. Жемчужный, ул. Рябиновая, 21. Кадастровый номер – 120481503601000560	Участок свободен от застройки. К кварталу застройки подведены: газ, электричество, вода	0,1767 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	3170,00	317,00	1684,45 кроме того, плюс расходы на размещение объявления о проведении аукциона в СМИ

1. Аукцион состоится 29 ноября 2019 года в 15.00 в здании Барановичского районного исполнительного комитета по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, 79, библиотека райисполкома.

2. Условие аукциона:

– наличие не менее двух участников;

– строительство жилого дома в течение двух лет с момента предоставления земельного участка.

3. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10 %.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

– заверенную банком копию платежного поручения (квитанция) о внесении задатка;

– копию документа, удостоверяющего личность, (паспорт) покупателя или его доверенного лица;

– доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет до 26 ноября 2019 года до 17.00 на расчетный счет BY13AKBB36002110500010000000, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УПП 200676206. Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, б-р Штоккерау, д. 8а. Получатель: Жемчужненский сельский исполнительный комитет, 225316, Брестская область, Барановичский район, агрогородок Жемчужный, ул. Ленина, 3.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Победитель аукциона обязан: оплатить в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, по оформлению и государственной регистрации создания земельных участков, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи: каждую среду недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел.: 65-60-23, 65-60-09.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 29 октября 2019 года с 8.00 по 13.00 и с 14.00 до 17.00 (сельисполком). Последний день приема документов – 26 ноября 2019 года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – 27 ноября 2019 г. с 14.00–15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

12. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату за земельный участок; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукционе

ЛОТ 1: трактор Т-25А, 1990 г. в., го № СА0003, заводской № 562316 с прицепом тракторным 1 ПТС-2, 1993 г. в., гос № ГЖ 3089, заводской № 166

Условия проведения аукциона:

– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на проведение независимой оценки имущества в размере 193,60 руб.

Начальная цена продажи – 8 064 руб. (восемь тысяч шестьдесят четыре рубля) с учетом НДС.

Сумма задатка – 806 руб. (восемьсот шесть рублей)

ЛОТ 2: трактор МТЗ-82, 1993 г. в., гос. № 6514 СВ-4, заводской № 398883.

Условия проведения аукциона:

– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на проведение независимой оценки имущества в размере 96,80 руб.

Начальная цена продажи лота 6 624 руб. (шесть тысяч шестьсот двадцать четыре рубля) с учетом НДС.

Сумма задатка – 662 руб. (шестьсот шестьдесят два рубля)

Продавец – открытое акционерное общество «Лакокраска», г. Лида, 231300, г. Лида, ул. Игнатова, 71, Тел. 8-0154-53-84-30, факс 8-0154-53-85-92

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/сч для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 13 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.**

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.09.2019 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник–четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.

Последний день приема заявлений – 11 ноября 2019 г. до 15.00

Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by